6. *Устюгова, М.* Сайт учреждения культуры: как создать, что размещать и как привлекать посетителей / М. Устюгова. – М. : Актион-МЦФЭР, 2020. – 106 с.

УДК 82'42(476)Гарун

# ДЫЯЛЕКТЫЧНЫЯ ІДЭІ Ў СВЕТАБАЧАННІ АЛЕСЯ ГАРУНА

***А. І. Бабко,*** *кандыдат філасофскіх навук, дацэнт, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** Вывучэнне жыцця і творчасці выдатных прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай культурнай традыцыі істотным чынам спрыяе яе падтрыманню і развіццю. Алесь Гарун належыць да кола выбітных дзеячаў культуры Беларусі, і даследаванне яго спадчыны таксама мае згаданае высокае прызначэнне. Мэта артыкула – раскрыць месца дыялектычных стратэгій у светабачанні паэта. Хоць задачы, якія паўстаюць пры гэтым, з'яўляюцца досыць спецыяльнымі, іх вырашэнне мае істотнае значэнне ў кантэксце вывучэння ўсяго творчага даробку Алеся Гаруна. Грунтоўны філасофскі складнік прысутнічае ў ім арганічна і неад'емна, таму без яго дэталёвага аналізу нельга глыбока зразумець і растлумачыць творы паэта. У выніку праведзенага даследавання зроблена выснова аб глыбокай прыхільнасці Алеся Гаруна да дыялектычнага мыслення і аб рэалістычным характары дыялектычнай асновы створанай ім мастацка-філасофскай карціны свету.

**Ключавыя словы:** дыялектычнае мысленне, дыялектычны скачок, рэалістычная дыялектыка, ідэал, самаразвіццё, светабачанне, спекулятыўная дыялектыка, супярэчнасць, трансцэндэнтальная дыялектыка, трыяда, экзістэнцыяльная дыялектыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# DIALECTIC IDEAS IN ALES GARUN'S WORLDVIEW

***A. Babko,*** *PhD in Philosophy, Associate Professor, Associate Professor of the Department of Social Sciences and Humanities of the Educational Establishment «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The study of the life and work of outstanding representatives of our national cultural tradition significantly contributes to its maintenance and development. Ales Garun belongs to the circle of notable figures of Belarusian culture, and the study of his heritage also has the above-mentioned high purpose. The purpose of the article is to reveal the place of dialectical

strategies in the poet's worldview. Although the issues that arise are quite special, their solution is essential in the context of studying the entire creative work of Ales Garun. The fundamental philosophical component is present in it organically and inseparably, so without its detailed analysis it is impossible to deeply understand and explain the works of the poet. As a result of the research, Ales Garun's deep commitment to dialectical thinking and the realistic nature of the dialectical basis of his artistic and philosophical picture of the world are concluded.

**Keywords:** contradiction, dialectical leap, dialectical thinking, existential dialectics, ideal, realistic dialectics, self-development, speculative dialectics, transcendental dialectics, triad, worldview.

Значнае месца ў даробку Алеся Гаруна належыць творам, якія маюць характар філасофскага роздуму. На іх звярнулі ўвагу даследчыкі жыцця і творчасці паэта [2, с. 341; 3, с. 324–325]. Тым не менш задача вывучэння, інтэрпрэтацыі і ацэнкі філасофскага складніка спадчыны Гаруна яшчэ знаходзіцца на першапачатковай стадыі свайго вырашэння. Мэта дадзенага даследавання – паспрыяць яе вырашэнню. Гэта важна і ў тэарэтычным, і ў практычным плане, бо паэт уваходзіць у кола выдатных прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай традыцыі, і вывучэнне кожнага аспекту яго даробку мае істотнае значэнне для яе глыбокага разумення, падтрымання і развіцця.

Сітуацыя, якая ствараецца мужным парываннем чалавека да разумення свайго месца ў Сусвеце, сваёй існасці, сэнсу свайго існавання, надзвычай глыбока раскрываецца Алесем Гаруном у вершы «Адбітак». Лірычны герой гэтага твора ахоплены палкім памкненнем пазнаць Адвечнае і Бясконцае, але ён усведамляе недасягальнасцьтакой вышыні для чалавека з яго супярэчлівай існасцю. Паэт выказвае дадзеную думку не наўпрост, а ў форме пытання, якім завяршаецца згаданы верш: «Нашто пачаўся я ад Бога – чалавекам?» [1, с. 74]. Некатэгарычны, «пытальны» фінал твора мае глыбокае значэнне: ён сімвалізуе вечную незавершанасць, адкрытасць чалавечага быцця і падкрэслівае яго незвычайную складанасць, невычэрпнасць і парадаксальнасць (сапраўды, чалавек выступае і як носьбіт Боскага першапачатку, і як цялесная, смяротная істота).

Фактычна Алесь Гарун фіксуе тут кропку, з якой можа разгортвацца як трансцэндэнтальная, так і экзістэнцыяльная дыялектыка. У пэўным сэнсе і ў пэўнай ступені абедзве гэтыя магчымасці здзяйсняюцца ў творчай філасофска-мастацкай лабараторыі паэта. Яго ўвага засяроджваецца найперш на тых аспектах згаданых спосабаў дыялектычнага мыслення, якія маюць істотнае значэнне для духоўных пошукаў чалавека і чалавецтва, для вызначэння іх стратэгій, асноўных напрамкаў і арыенціраў. У вершы «Бажанне», напрыклад, раскрываюцца інтэнцыі, якія паўстаюць на грунце, блізкім да трансцэндэнтальна-дыялектычнага. Яго лірычны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

герой не верыць у магчымасць пазнаць глыбокую, невычарпальна багатую існасць Сусвету («Не прашу я, Божухна, Твайго свету знаці – // Ўсе пачаткі, змены, і канцы, і рух»). Разам з тым, аднак, ён не адмаўляецца ад надзеі адкрыць і зразумець прынцыпы, якія кіруюць чалавечым жыццём («Дай адно людскую праўду мне паняці // І яе быць верным, найпадданьшым з слуг» [1, с. 96]. У творах Гаруна гучаць і экзістэнцыяльна-дыялектычныя матывы: паэт цудоўна разумеў, што чалавек у сваім памкненні да прыгожага і ўзнёслага мусіць штохвілінна, з напружаннем усіх духоўных сіл пераадольваць сваю недасканаласць, сваю слабасць, якая няспынна і пільна выцікоўвае, каб ахінуць яго «душу ганебным сном» [1, с. 128], ашукаць яе, пазбавіць сапраўднага быцця.

Праз мастацкую апрацоўку пэўных аспектаў згаданых стратэгій дыялектычнага мыслення, праз выяўленне іх месца ў духоўным жыцці Алесь Гарун паказвае, што па сутнасці яны выступаюць як моманты невычарпальна складанай, супярэчлівай, напоўненай вострымі калізіямі і праблемамі духоўнай рэчаіснасці. Гэта дазваляе сцвярджаць, што светабачанне паэта грунтавалася на ідэі, згодна з якой і рэальнасць, і яе пазнанне маюць дыялектычны характар. Мы будзем называць такі варыянт дыялектыкі рэалістычным. Найбольш выбітнымі яго прадстаўнікамі ў філасофіі Новага часу з'яўляюцца Гегель і Маркс, праз іх пошукі рэалістычны варыянт у сваю чаргу дыверсіфікуецца, выяўляе ўнутраныя адрозненні.

Несумненна, дыялектыка Маркса істотна паўплывала на творчасць Алеся Гаруна. Таксама можна з пэўнасцю сцвярджаць, што менавіта яе рэалістычнасць прыцягвала паэта. Крытыкуючы тых марксістаў, якія адмоўна ставіліся да нацыянальнага руху, што разгарнуўся на руінах Расійскай імперыі, ён папракаў іх у адыходзе ад дыялектычных прынцыпаў (яны «забыліся саўсім аб правіле "спосаб разумавання марксізму дыялектычны"») [1, с. 348]. З яго пункту гледжання, згаданыя прынцыпы забараняюць гвалт у дачыненні да рэальнасці, не дапускаюць навязвання ёй ідэалу, калі ў яе нетрах яшчэ не выспелі ўмовы для яго здзяйснення.

Цяжка сказаць, ці вывучаў Алесь Гарун філасофію Гегеля. Тым не менш відавочна, што шмат якія аспекты яго творчай спадчыны адзначаны блізкасцю да спекулятыўнай гегелеўскай дыялектыкі. Як было падкрэслена вышэй, паэт цудоўна разумеў і пераканальна паказаў супярэчлівы характар духоўнага жыцця чалавека і чалавецтва. Пры гэтым ён ясна ўсведамляў момант адзінства станоўчага і адмоўнага бакоў духоўных працэсаў (такія ідэі належаць да ключавых у філасофіі Гегеля). Яскравым прыкладам глыбокага філасофска-мастацкага пранікнення ў супярэчлівую натуру чалавечага быцця, здольную ператварыць адмоўнае ў фактар свайго самаразвіцця, з'яўляецца верш «Nokturno». Яго лірычны герой вядзе дыялог са сваёй Нядоляй, якая – падобна платонаўскай Дыятыме – выконвае ў ім ролю надзеленай высокай мудрасцю

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

настаўніцы. Ужо сам гэты сюжэт мае глыбокае сімвалічнае значэнне: вострыя, пакутлівыя супярэчнасці і калізіі даюць наймагутнейшы штуршок дзейнасці, барацьбе, пазнанню, у якіх і праз якія чалавек развіваецца, ідзе наперад. Разам з тым дадзеная думка ў вершы выказваецца выразным, артыкуляваным чынам: «Пакуту Рок табе, шчасліваму, прызначыў, // І ўдзячным за яе Вялікаму ты будзь. // Няма пакуты дзе – няма пазнання» [1, с. 124].

Аднак момант адзінства станоўчых і адмоўных аспектаў духоўных працэсаў раскрываецца ў згаданым вершы і з іншага пункту гледжання, з пункту гледжання менавіта іх характару. Алесь Гарун паказвае, што нараджэнне новага непарыўна знітавана з адмаўленнем старога: «Расцець дубочак тут, – які зялёны! // Другі, стары, калодаю палёг; // І сын ідзець ўгару, як бацька у час мінёны, // Што даў жыццё яму, а сам зваліўся ў мох» [1, с. 124]. Акрамя таго, паэт набліжаецца да ідэі дыялектычных скачкоў у працяканні прыродных і грамадскіх працэсаў: як ручай знікае ў зямлі, каб вырвацца з яе шырокай ракой, так і паасобныя чалавечыя дзеянні, намаганні, памкненні павінны перакінуцца ў магутную плынь (тут акрэсліваецца разам з тым момант адзінства індывідуальнага і ўсеагульнага ў самаразвіцці прыроды і духа) [1, с. 124].

У філасофска-мастацкім асэнсаванні шляхоў і формаў разгортвання духоўнага жыцця, здзейсненым Алесем Гаруном, не абмінаецца ўвагай і такая грунтоўна важная фігура дыялектычнага мыслення, як трыяда. У легендзе (так ідэнтыфікуе жанр свайго твора сам аўтар) «Першы снег» ён апісвае складаны, драматычны характар здзяйснення ідэалу маральнай чысціні і прыгажосці ў супярэчлівым, несправядлівым грамадстве: чыстыя, некранутыя брыдотай маладыя душы робяцца ахвярамі гарадской цывілізацыі, уваходзячы ў яе атрутную атмасферу, што спараджае недольную патрэбу пераадолення пачварлівых формаў грамадскага жыцця і аднаўлення яго высокага, светлага, маладога пачатку.

Такім чынам, дыялектыка не толькі не была чужой Алесю Гаруну, але і належыць да грунтоўных, вызначальных характарыстык яго светабачання. Дыялектычнае мысленне ў яго інтэрпрэтацыі – гэта мысленне рэалістычнае, на рэалістычна-дыялектычнай аснове (блізкай да ідэй Гегеля і Маркса) выбудоўваецца яго філасофска-мастацкая карціна свету. Увага паэта засяроджваецца найперш на супярэчнасцях, калізіях і канфліктах, уласцівых духоўнай рэчаіснасці: яны патрабуюць дзейнасці, высілкаў, змагання – таго, чым было адзначана яго ўласнае жыццё і да чаго ён заклікаў іншых.

1. *Гарун, А.* Выбраныя творы / А. Гарун ; уклад., прадм., камент. У. Казберука. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2003. – 448 с. – (Беларускі кнігазбор ; Сер. 1. Мастацкая літаратура).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Гарэцкі, М.* Гісторыя беларускае літаратуры / М. Гарэцкі ; уклад. і падрыхт. тэксту Т. С. Голуб. – Мінск : Маст. літ, 1992. – 479 с.

3. *Казбярук, У. М.* Алесь Гарун / У. М. Казбярук // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999. – Т. 1. – С. 319–334.

УДК 78.071:361.363/364

# СОВРЕМЕННАЯ МУЗЫКА: ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫЕ ПРОЕКТЫ ДЛЯ КОМПОЗИТОРОВ

***И. И. Банникова,*** *кандидат искусствоведения, доцент, заслуженный работник культуры Российской Федерации, заведующий кафедрой теории и истории музыки федерального государственного образовательного учреждения высшего образования «Орловский государственный институт культуры», г. Орел*

**Аннотация.** Одной из проблем современного композиторского образования является недостаточная представленность в нем теории и практики новой музыки. Статья посвящена обзору и сравнительной характеристике крупнейших отечественных образовательных проектов для молодых композиторов, возникших во втором десятилетии XXI в., призванных восполнить этот пробел.

**Ключевые слова:** образовательный проект, композиторские курсы, композиторские читки, лаборатория современной музыки, семинар новой музыки.

# MODERN MUSIC: EDUCATIONAL PROJECTS FOR COMPOSERS

***I. Bannikova,*** *PhD in Art History, Associate Professor, Honored Worker of Culture of the Russian Federation, Head of the Department of Theory and History of Music of the Federal State Educational Institution of Higher Education «Oryol State Institute of Culture», Oryol*

**Abstract.** One of the problems of modern composer education is the insufficient representation of the theory and practice of new music in it. The article is devoted to the review and comparative characteristics of the largest domestic educational projects for young composers that arose in the second decade of the XXI century, designed to fill this gap.

**Keywords:** educational project, composer courses, composer readings, laboratory of modern music, seminar of new music.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ